*А.В.БАДАКОЎ*

# АДЗІНСТВА МЕНТАЛІТЭТУ, НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ І КУЛЬТУРЫ НАЦЫІ

Праблема, вынесеная ў назву артыкула, мае не толькі тэарэтычнае, але і жыццёва-практычнае значэнне. Вядома, што індывіды і іх сацыяльныя супольнасці стыхійна ці свядома ў працэсе жыццядзейнасці задавальняюць свае патрэбнасці, рэалізуюць інтарэсы, паўсядзённыя стратэгічныя мэты і ідэалы. У выніку ствараецца адзіная тканіна бесперапыннай гісторыі народа, краіны. Пры гэтым найбольш выразныя асаблівасці гісторыя народа набывае ў залежнасці ад таго, якія этнанацыянальныя супольнасці яе стварылі. Унікальнасць гісторыі кожнага народа — гістарычны факт і агульная заканамернасць. Чаму так атрымліваецца?

Каб адказаць на гэтае пытанне, акрэслім сутнасць паняццяў нацыі, менталітэту, самасвядомасці нацыі, нацыянальнай ідэі, нацыянальнай ідэалогіі.

Нацыя, як усялякая сацыяльная рэальнасць, мае свае вытокі, умовы ўзнікнення і развіцця, сваю гісторыю і, зразумела, не толькі сваё мінулае і сучаснае, але і сваю будучыню. Як гістарычная супольнасць нацыя характарызуецца наступнымі сацыяльна-псіхалагічнымі і сацыяльнымі якасцямі:

а) унікальным псіхалагічным складам, “профілем”, своеасаблівым стылем, вобразамі мыслення, пачуццёва-эмацыянальнага светаўспрымання, ці менталітэтам;

б) адзінай самасвядомасцю, ядром якой з’яўляецца самаідэнтыфікацыя;

в) роднай мовай, яе лексікай, стылем і іншымі спецыфічнымі сродкамі вызначэння нацыянальнай свядомасці і самасвядомасці;

г) самабытнай матэрыяльнай і духоўнай культурай, у якой адбываецца самарэалізацыя “душы” нацыі як унікальнай духоўнай скарбніцы;

д) агульнымі этнічнымі каранямі (маюцца на ўвазе маці-зямля, бацькаўшчына);

е) нацыянальнай дзяржаўнасцю (нацыя — гэта народ, арганізаваны ў дзяржаву).

Зразумела, нацыя — прадукт працяглага гістарычнага развіцця, якое нельга ўявіць сабе, калі не ўлічваць некаторых абставін і глыбінных прычын.

Працэс узнікнення і развіцця нацыі складаецца з двух узаема-дзеючых інварыянтных працэсаў — фарміравання і развіцця агульначалавечых, відавых асаблівасцей і унікальна непаўторных, якія абумоўліваюць уласна нацыянальныя рысы сацыяльных супольнасцей. Чалавек ва ўсе часы застаецца мерай усіх рэчаў, сутнасцю яго з’яўляецца своеасаблівае спалучэнне ўсеагульных, агульных і адзінкавых, г.зн. відавых, этнанацыянальных і унікальна асобасных, якасцей. Агульначалавека няма на Зямлі, індывіды заўсёды нацыянальныя. Нацыя — гэта калыханка асобы, самае каштоўнае на свеце, што можа быць у яе. Крыніца быцця нацыі, ажыццяўлення яе агульных (нацыянальных) інтарэсаў — дзяржава. Толькі пры наяўнасці трох падстаў: уласнай нацыянальнай “душы”, нацыянальнай культуры і нацыянальнай дзяржавы — народ мае гарантаваную і вартую годнасці будучыню. Чым больш мы будзем нацыянальнымі, тым больш мы будзем еўрапейцамі і “агульначалавекамі”. Гэтую думку ў свой час выказаў Ф.М.Дастаеўскі ў артыкуле “Два лагеры тэарэтыкаў”. Яна актуальная і сёння. Такім чынам, сэнс і прызначэнне нацыі — ажыццявіць натуральна-арганічны росквіт сваіх духоўных і сацыякультурных магчымасцей, таго унікальнага, што ёсць у нацыі, бо росквіт чалавецтва магчымы толькі на падставе росквіту кожнай нацыі, кожнага этнасу.

Фарміраванне і развіццё нацыі — гэта перш за ўсё працэс станаўлення і развіцця яе духоўнага складу, псіхічных якасцей, менталітэту, самасвядомасці і нацыянальнай свядомасці, нацыянальнай ідэі і нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі. Разгледзім некаторыя паняцці нацыянальнай ідэнтыфікацыі.

Менталітэт нацыі — гэта гістарычна сфарміраваны своеасаблівы вобраз мыслення, спосаб і стыль светаадчування, светаўспрымання і светаразумення, якія абумоўліваюць пачуццёва-эмацыянальныя і светапоглядныя адносіны да навакольнага свету, сябе, свайго месца ў грамадстве і сусвеце.

Ментальнасць нацыі, як і кожнай асобы, мае два ўзроўні — падсвядомы, глыбінны, які бярэ свой пачатак у родаплемянным генафондзе і складзе жыцця (“калектыўнае

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

падсвядомае"), і свядомы, ядро якога складае асэнсаванне ўласнага менталітэту, асобнасці і унікальнасці штодзённага жыцця, яго ўключанасці ў агульнагістарычны працэс. На падставе менталітэту нацыі фарміруецца ўвесь складаны і разнастайны духоўны свет нацыі і кожнага індывіда, менавіта тая сістэма архетыпаў нацыянальнай свядомасці, якая склалася на пачатковых ступенях станаўлення нацыі і састаўляе яе "код", што накіроўвае далейшы нацыянальна-духоўны, нацыянальна-культурны працэс. Менталітэт, такім чынам, нацыя змяніць не можа, пакуль яна застаецца менавіта гэтай нацыяй. Менталітэт нацыі, як і яе геапалітычнае прызначэнне, мае карані ў зыходных геаграфічных, біяэтнічных і сацыяэтнічных перадумовах узнікнення нацыі.

Менталітэт нацыі заўсёды выступае як унікальны спосаб асэнсавання прыроднага і сацыяльнага быцця. Менавіта таму ён заўсёды характарызуецца пэўнай накіраванасцю, вызначэннем мэт, фарміраваннем ведаў і каштоўнасцей, нормаў жыцця, вобразаў будучыні — ідэалаў. І гэта заканамерна, бо светаадчуванне і светаразуменне грунтуюцца на пачуццях і эмоцыях, якія больш ці менш звязаны з біясацыяльнымі патрэбамі і нацыянальнымі інтарэсамі супольнасцей і індывідаў. Зразумела, што ўсё гэта не можа не ствараць калектыўную настроенасць, пэўную духоўную напружанасць, якая і трансфармуецца заўсёды ў адпаведныя матывы і мэты дзейнасці, яны, у сваю чаргу, вызначаюць вектар сацыяльнай актыўнасці нацыі. Менталітэт, як своеасаблівы і непаўторны спосаб мыслення, адчування, светаўспрымання і эмацыянальна-інтэлектуальнага рэагавання, увасабляецца ярчэй за ўсё ў такіх сістэмах нацыянальнай культуры, як мова, фальклор, народная музыка і спевы, танец, стыль працы і культавых абрадаў і шмат іншым, на падставе чаго фарміруецца ўся будова нацыянальнай культуры. Вось чаму кожны з нас пры ўспрыманні народнай творчасці беспамылкова вызначае яе нацыянальную прыналежнасць. Трэба адзначыць, што менавіта мова з'яўляецца першай і асноўнай формай матэрыялізацыі менталітэту, нацыянальнай свядомасці. Менавіта яна адыгрывае ў культуры сістэмавызначальную ролю. А паколькі мова захоўвае ў сабе ўсеагульныя сэнсы і значэнні — усю тую інфармацыю, якая здабыта народам і чалавецтвам на працягу гісторыі, пастолькі яна дазваляе "раскадзіраваць" якасці, нюансы нацыянальнай душы і атрымаць ключ да адэкватнага ўспрымання яе і духу культуры, ёю створанай. Дарэчы, нацыянальныя нюансы не заўсёды, асабліва ў некаторых відах мастацтва і культуры, кідаюцца ў вочы. Без уліку гэтага нельга зразумець, напрыклад, што такое беларускасць, нацыянальная свядомасць.

Усебаковыя ўяўленні менталітэту маюць важнае значэнне для інтэрпрэтацыі праблемы нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Апошняя прадугледжвае вызначэнне сістэмы такіх істотных уласцівасцей нацыі, якія давалі б магчымасць атаясамлівання індывіда, носьбіта гэтых уласцівасцей, з адпаведнай нацыянальнай супольнасцю і яе прадстаўнікамі, якія лічаць сябе суб'ектамі гэтай супольнасці. Толькі ў выніку такой самаідэнтыфікацыі індывід добраахвотна ўспрымае думкі, веды, пачуцці і дзеянні, якія зыходзяць ад "роднай" нацыі, а рэалізацыю іх разглядае як самарэалізацыю. На наш погляд, сацыялізацыя як адзін з фундаментальных шляхоў станаўлення асобы павінна будавацца на падставе нацыянальных каштоўнасцей і рэалій. Душа асобы, вектар яе дзейнасці і ідэалы заўсёды павінны мець нацыянальную форму і змест. Зразумела, што і ўся сістэма адукацыі і выхавання павінна быць прасякнута нацыянальным духам.

Паколькі менавіта сістэма істотных якасцей нацыі з'яўляецца падставай для нацыянальнай ідэнтыфікацыі, то мы на аснове ўласнай гіпотэзы хацелі б іх тут акрэсліць. З улікам прыярытэтнасці шкала такіх якасных асаблівасцей беларускай нацыі, якія склаліся на працягу ўсяго працэсу яе станаўлення, будзе наступнай:

— своеасаблівы этнапсіхалагічны вобраз і стыль мыслення і адчування, ядро якіх складае беларускасць, беларускі менталітэт;

— беларуская мова як тыповая з'ява, але на яе падставе магчымы і білінгвізм, і полілінгвізм;

— нацыянальная культура — матэрыяльная і духоўная;

— нацыянальныя агульныя інтарэсы;

— хрысціянскія маральныя і іншыя каштоўнасці;

— адчуванне роднай бацькаўшчыны, маці-зямлі;

— памяркоўнасць, разважлівасць, цярплівасць, непрыманне ўціску;

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

— любоў да працы, імкненне жыць уласнай працай;
— прыхільнасць да сацыяльнай роўнасці, свабоды і сацыяльнай справядлівасці;
— вера ў агульнанацыянальную будучыню, перакананне ў рэальнасці ідэалаў лепшага будучага, сацыяльны аптымізм;
— прыхільнасць да агульначалавечых каштоўнасцей, глыбокая павага да іншых нацый і дзяржаў.

Нам падаецца, што гэтыя якасці можна лічыць не толькі падставай самаідэнтыікацыі беларусаў. Яны былі б названы, калі б нам давялося даведацца аб тым, што пра нас думаюць іншыя нацыі, народы і дзяржавы.

Зразумела, праблема ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі непа-срэдна звязана з нацыянальнай свядомасцю і самасвядомасцю. Нацыянальная самасвядомасць — гэта:

а) веды аб сваім менталітэце, каранях беларускасці, сваім унікальна непаўторным духоўным абліччы сярод іншых народаў і этнічных супольнасцей;

б) самаўсведамленне той сістэмы аднолькавых сацыяльных і нацыянальна-псіхалагічных якасцей, уласцівых кожнаму індывіду, кожнай асобе, якія і дазваляюць ідэнтыфікаваць пэўны народ як нацыянальную супольнасць;

в) сістэма поглядаў і ўяўленняў аб сваім месцы і прызначэнні ў агульначалавечай супольнасці, наогул у свеце.

Інакш кажучы, нацыянальная самасвядомасць — гэта цэласны духоўны свет з карэннымі нацыянальнымі інтарэсамі, ідэаламі аб уласнай нацыі як суб'екце гістарычнага працэсу; з прынцыпамі арганізацыі свайго жыцця і адносін з усімі іншымі нацыямі, усім астатнім чалавецтвам. Самасвядомасць уключае пэўнае разуменне адзінства нацыянальнай мовы, нацыянальнага характару, культуры, тэорыі, дзяржаўнасці, пачуцця нацыянальнай годнасці.

Нацыянальная свядомасць складаецца з адзінай сістэмы маральна-рэлігійных, палітыка-прававаых, эканамічных, мастацка-эстэтычных, нацыянальна-этнічных і іншых поглядаў і каштоўнасцей. Ім адпавядае пэўная "шкала каштоўнасцей", якая свядома ці несвядома робіць уплыў на кірунак дзейнасці народа, надае ёй пэўны характар, пэўны менталітэт, нацыянальную светапоглядную афарбоўку.

Такім чынам, нацыянальная свядомасць узнімаецца да светапогляднага філасофскага, навукова-тэарэтычнага ўзроўню, што, у сваю чаргу, стварае падставу вызначэння чарговай, вышэйшай ступені самасвядомасці і свядомасці нацыі — нацыянальнай беларускай ідэі.

Духоўны працэс развіцця нацыянальнай свядомасці беларусаў не можа быць перапынены, як не можа быць перапынены працэс перарастання сучаснасці ў будучыню. Нацыянальная ідэя — гэта шлях да асэнсаванага будаўніцтва народам сваёй пажаданай будучыні. Яна ўзнікае і фарміруецца як заканамерны адказ народа на "заклік гісторыі", як заканамернае і непазбежнае ў сучасных умовах праектаванне народам сваёй будучыні на падставе вызначэння і навукова-каштоўнаснага асэнсавання ім сваіх доўгатэрміновых стратэгічных інтарэсаў. Можна лічыць заканамерным на сучасным этапе гістарычнага развіцця, што эвалюцыя нацыянальнай свядомасці трансфармуецца ў нацыянальную ідэю і нацыянальна-дзяржаўную ідэалогію. І гэта зразумела, бо кожнаму ясна, што адзіным гарантам нашага быцця, нашай нацыянальнай самабытнасці і палітычнай незалежнасці з'яўляецца дзяржава. А існаванне нацыянальнай дзяржавы немагчыма без нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі, якая не можа не быць салідарным, стваральным, жыццесцвярджальным светапоглядам, дзе агульначалавечыя і рэлігійныя каштоўнасці і інтарэсы рэалізуюцца як вынік ажыццяўлення ўласных нацыянальных, агульна-дзяржаўных каштоўнасцей, інтарэсаў і ідэалаў.

Натуральна, што нацыянальная самасвядомасць больш пэўна раскрываецца ў тэарэтычна асэнсаванай канцэпцыі існавання нацыі ў сучаснай глабальнай сітуацыі.

Нацыянальная ідэя — вобраз бліжэйшай і аддаленай будучыні народа і дзяржавы, яна — мадэль гэтай будучыні. Прагрэс краіны (народа і дзяржавы) немагчымы без тэарэтычнага мадэлявання будучыні, таму нацыянальная ідэя — неабходнасць.

Каб выканаць ролю рэальнага сродку тэарэтычнага і практычнага прагназіравання будучыні, нацыянальная ідэя павінна адпавядаць сістэме аб'ектыўных і суб'ектыўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрабаванняў, улічваючы якія, яна толькі і можа набыць адпаведныя яе прызначэнню якасці.

Нацыянальная ідэя, з аднаго боку, павінна з’яўляцца сістэмастваральнай ідэяй у духоўнай культуры народа, а з другога — адпавядаць “самамэце” развіцця грамадства і краіны, г. зн. аб’ектыўнаму напрамку развіцця грамадства; інакш кажучы, яе сутнасць, яе функцыі ў якасці духоўнага арыенціра народа і аб’ектыўная логіка сацыяльнага прагрэсу павінны супадаць. Інакш яе спасцігне лёс “няздзейснага ідэалу”.

Нацыянальная ідэя не павінна па сутнасці выглядаць канчатковай, сфармуляванай на стагоддзі; яна павінна быць навукова абгрунтаванай і арыентаванай на стратэгічныя мэты народа і дзяржавы. Разам з тым яна павінна на кожным гістарычным адрэзку часу канкрэтызавацца пакаленнямі, якія выступаюць на гістарычную арэну менавіта з улікам каштоўнасных арыентацый гэтых пакаленняў, з улікам новых гістарычных і геапалітычных змен.

На наш погляд, структура нацыянальнай ідэі ўключае прыкладна наступнае:

— навукова-тэхнічныя асновы неабходнасці рухацца наперад па шляху прагрэсу;

— змест нацыянальнай ідэі як ідэал, які абапіраецца на навуку, практыку, інтарэсы, менталітэт беларускай нацыі і нацыянальных меншасцей; ідэал, які акрэслівае контуры будучыні, перспектывы нацыянальнага і культурна-гістарычнага развіцця;

— агульную праграму стратэгічных і тактычных (кароткатэр-міновых) кірункаў дзейнасці народа і дзяржавы, якая перыядычна канкрэтызуецца імі з улікам “выклікаў гісторыі” і ініцыятыў часу;

— аб’яднальную парадыгму як адвечную мару кожнага беларуса, сутнасць якой заключаецца ў аб’яднанні ўсіх суб’ектаў гісторыі краіны ў мэтах іх усебаковага развіцця;

— канцэпцыю нацыянальнай дзяржаўнасці;

— адвечную мару аб сацыяльнай справядлівасці, роўных магчымасцях для кожнай асобы; свабода ў нацыянальнай ідэі выступае як умова гістарычнай самарэалізацыі менталітэту нацыі і кожнай асобы;

— канцэпцыю свабоды сумнення дастойных умоў жыцця, дабрабыту, дэмакратычнага ладу згодна з нацыянальнымі традыцыямі развіцця народа і кожнай асобы;

— уласнасць у трох яе асноўных формах — дзяржаўнай, прыватнай, калектыўнай;

— прыярытэт у сістэме канцэпцый, якія складаюць нацыянальную ідэю, духоўнасці, павагі да іншых народаў, сацыяльнага аптымізму, культу дзяцей, клопату аб старэйшых пакаленнях, прыхільнасці да славянскага братэрства і інш.;

— прызнанне ролі такіх грамадскіх устаноў і інстытутаў, як навуковыя, адукацыйныя, выхаваўчыя, культурна-асветныя, царкоўныя (з улікам поліканфесіянальнасці), аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту, адпачынку і інш.;

— стварэнне ўмоў для росквіту беларускай мовы як асноўнага фактару матэрыялізацыі менталітэту і духоўнай культуры нацыі, прыярытэт у сістэме культурных каштоўнасцей свету беларускай культуры;

— полілінгвізм пры асаблівай увазе да рускай мовы;

— прыхільнасць да культурнага ўзаемадзеяння з іншымі народамі на ўзроўні ўзораў культуры і інш.

Нацыянальная ідэя тады стане фактарам прагрэсу і росквіту народа, калі яна будзе садзейнічаць новым прасторам сацыяльна-культурнай творчасці.

У ідэале нацыянальная ідэя павінна стаць глыбіннай інфармацыйнай асновай менталітэту, усёй матывацыйнай сферы народа і кожнай асобы, яе перакананняў, каштоўнасных арыентацый, веры, светапогляду, стылю мыслення, эмацыянальных прыярытэтаў.

Нацыянальная ідэя павінна стаць сутнасцю ўсёй інфармацыйна-духоўнай прасторы Рэспублікі Беларусь, ахопліваць навуку, культуру, рэлігію, мараль, палітыку, права, вытворчасць, быт, адпачынак, усе віды грамадскіх адносін. Нацыянальная ідэя — гэта спосаб рэалізацыі творчай унікальнасці беларускага народа, якая параджае новы, больш высокі ўзровень айчыннай і сусветнай культуры. Нацыянальная ідэя — гэта адзіная памяць нацыі, матрыца яго архетыпаў і кодаў новых творчых здзяйсненняў. Натуральна, што нацыянальная ідэя больш поўна раскрываецца ў тэарэтычна асэнсаванай канцэпцыі існавання нацыі ў сучаснай глабальнай сітуацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблемы і аспекты, складаючыя сутнасць менталітэту, нацыянальнай ідэі і нацыянальнай культуры, — лёсавызначальныя для кожнага народа. Таму менавіта праз іх прызму павінны будавацца сучасная адукацыя, фарміравацца гуманітарныя светапоглядныя веды і маральныя якасці кожнай асобы этнанацыянальных супольнасцей і народаў. Толькі як частка агульначалавечага духоўна-культурнага разнаквецця можа “прырастаць” духоўны, сацыяльна-культурны, творчы патэнцыял беларускага народа. Адсюль і пачэснае прызначэнне кожнага грамадзяніна, кожнай асобы нашай краіны — трывала засвоіць усё багацце нацыянальна-культурнай спадчыны і ўдасканальваць яго.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ